УДК [394.86+94:343.614](476)“18/19”

# «СЛУЧАЙ СМЕРТИ ПРЕДАТЬ ВОЛИ БОЖЬЕЙ»: ПРАБЛЕМА БЫТАВОГА САМАГУБСТВА Ў БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Сакольчык А. Э.*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца праблема бытавога самагубства ў беларускім грамадстве другой паловы XIX – пачатку XX ст. Выяўлены пэўны рэйтынг у прычынна-матывацыйным спектры добраахвотнага сыходу з жыцця, праведзена відавая характарыстыка і адзначаны асаблівасці прыроды самазабойства, яго спецыфічныя маркеры (спосабы, характар, месцы здзяйснення). Таксама праследжана станоўчая дынаміка суіцыдальнай актыўнасці насельніцтва краю. Асвятляюцца нюансы заканадаўства разам з правапрымяняльнай практыкай пры вызначэнні адказнасці за пазбаўленне сябе жыцця, звернута ўвага на народнае ўяўленне аб з’яве.*

***Ключавыя словы:*** *самагубства (суіцыд); злачынства; крымінальнае права; пакаранне; хрысціянская традыцыя; народнае ўяўленне; дынаміка; матыў; спосаб.*

# «THE CASE OF DEATH IS TO SURRENDER TO THE WILL OF GOD»: THE PROBLEM OF DOMESTIC SUICIDE IN BELARUSIAN SOCIETY IN THE SECOND HALF OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURIES

*Sokolchik E. Ed.*
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The paper examines the problem of domestic suicide in Belarusian society in the second half of the 19th and early 20th centuries. A certain ranking in the causal and motivational spectrum of voluntary suicide is identified, a specific characterization is carried out, and the features of the nature of suicide and its specific markers (methods, nature, places of commission) are noted. The positive dynamics of suicidal activity among the region’s population are also traced. The nuances of the legislation are considered, along with law enforcement practice in determining responsibility for taking one’s own life, and attention is paid to the popular perception of the phenomenon.*

***Keywords:*** *suicide; crime; criminal law; punishment; Christian tradition; popular imagination; dynamics; motive; method.*

Паводле заканадаўства Расійскай імперыі другой паловы XIX ст. самагубства вылучалася ў самастойную разнавіднасць злачынстваў супраць жыцця. Ва «Улажэнні аб пакараннях крымінальных і папраўчых» 1845 г. мелася асобная глава «Аб самагубствах» (артыкулы 1943–1947). У ёй прадугледжвалася адказнасць крымінальнага, грамадзянскага і рэлігійнага характару. Безумоўнай мерай пакарання выступала забарона хаваць самагубцу ў адпаведнасці з хрысціянскімі традыцыямі і царкоўнае пакаянне за замах на самазабойства, калі акт здзяйсняўся не ў стане вар'яцтва або беспамятстве. Таксама тэстаменты ахвяры і яе перадсмяротныя распараджэнні лічыліся не маючымі юрыдычнай моцы. Выключэнне складалі суіцыды ў нармальным разумовым стане па прычыне патрыятызму з мэтай захавання дзяржаўнай тайны або цноты і гонару жанчынай. Яны вызваляліся ад усялякай адказнасці. Садзейнічанне ў самагубстве прыроўнівалася да садзейнічання ў забойстве з абдуманым намерам. Пакаранне ўключала пазбаўленне ўсіх правоў стану, ссылку ў катаргу на рудніку ад 12 да 15 гадоў, непазбаўленых па законе цялесных пакаранняў (цалкам адменены ў 1863 г.) чакала клейманне і біццё бізунамі праз палачоў 70–80 удараў. Асобны артыкул належаў пакаранню бацькоў і апекуноў, якія злоўжывалі ўладай, чым заахвочвалі падапечнага пайсці на суіцыд. Іх пазбаўлялі некаторых асабістых правоў, пераваг і заключалі ва ўціхамірвальны дом ад 1 да 2 гадоў, плюс царкоўнае пакаянне [1, с. 754–755]. Падобныя пастулаты перайшлі і ў рэдакцыі «Улажэння» 1866 і 1885 гг. з нязначнымі карэкціроўкамі тэрмінаў зняволення (артыкулы 1472–1476) [2, с. 558–559; 3, с. 515–517].

Значная трансфармацыя і лібералізацыя адзначаных вышэй практык адбываецца ва «Улажэнні» 1903 г. (хаця яно ўступіла ў сілу часткова, пераважна па дзяржаўных і рэлігійных злачынствах). Менавіта ў ім адмовіліся ад папярэдніх норм адказнасці за самазабойства. Разглядаліся толькі садзейнічанне і давядзенне да самагубства (артыкулы 462 і 463 главы 23 «Аб цялесным пашкоджанні і гвалце над асобай»). За першую правіну пагражала заключэнне да 3 гадоў у папраўчы дом ці крэпасць, за другую – катарга да 8 год [4, с. 148]. Новаўвядзеннем кодэкса стала фіксацыя асобнага віда самагубства па жэрабю (па дамове з супернікам). За яго прысуджалася катарга да 8 гадоў. За замах на жыццё з такой нагоды прадугледжваўся арышт у папраўчы дом на тэрмін 1,6–6 год (артыкулы 488, 18) [4, с. 156; 15].

Самагубства доўгі час з'яўлялася табуіраванай тэмай і цалкам замоўчвалася. Вядомы класічны прыклад аб забароне міністра асветы

А. С. Шышкова аднаму з членаў імператарскай Акадэміі навук апублікаваць у 1823 г. сваё даследаванне аб забойствах і самагубствах у Расійскай імперыі за 1819–1820 гг. паводле ўрадавых дадзеных. У яго рэзалюцыі на рукапіс адзначалася: «Мне кажется, подобные статьи, неприличные к обнародованию оных, надлежало бы к тому, кто прислал их для напечатания, отослать назад с замечанием, чтоб и впредь над такими пустыми вещами не трудился. Хорошо извещать о благих делах, а такие, как смертоубийство и самоубийство, должны погружаться в вечное забвение» [5, с. 86].

З 1860-х гг. суіцыд паступова ператварыўся ў прадмет газетных хронік, публіцыстыкі, літаратурных твораў, статыстычных аналізаў і пачаў успрымацца як сацыяльная з’ява. Адпаведны штуршок для галоснасці далі рэформы судовай сістэмы, развіццё статыстычных камітэтаў, органаў мясцовага самакіравання і масавага друку. Паглыбленае вывучэнне праблемы юрыстамі, сацыялогамі, філосафамі парадзіла крытыку караемасці самагубства і пераследу суіцыдантаў. Так, П. Д. Калмыкаў лічыў меры, прымаемыя пасля смерці самагубцы, датычнымі толькі яго блізкіх, якія ва ўчынку нявінныя, таму наяўныя заканадаўчыя нормы апраўдваў толькі намерам застрашыць іншых прытрымлівацца прыкладу самагубцы. У. Д. Набокаў называў пакаранне мёртвага юрыдычным абсурдам [6, с. 91–92]. У 1877 г. Сенат агучыў даволі радыкальную думку: «Судить самоубийство в уголовном порядке нельзя, то и вопрос о действительности или недействительности оставленного самоубийцей духовного завещания должен подлежать обсуждению суда гражданского, а не уголовного» [Цыт. па: 6, с. 92]. Дзякуючы старанням навукоўцаў пачаўся працэс дэкрыміналізацыі.

Такім чынам, да пачатку XX ст. у адказнасці за самагубства аб’ядноўваліся дзве юрыдычныя практыкі – кананічная і грамадзянска-прававая. У хрысціянскай традыцыі самагубства адносіцца да ліку аднаго з найбольш цяжкіх грахоў і супярэчыць асноўнай запаведзі «Не забі», спалучаючыся з грахом адчаю. Самагубцу не хаваюць па царкоўным абрадзе, яго нельга памінаць у царкоўнай малітве за літургіяй і на паніхідах. Яму, пайшоўшаму супраць Божай волі, не даецца надзея і на пасмяротнае выратаванне. Але дзяржавай суіцыд успрымаўся, у першую чаргу, як грамадскі ўчынак. Маніпуляцыі з рэлігійнымі каштоўнасцямі і ўбудаванне іх у заканадаўчы механізм мелі за мэту стварыць прэвентыўныя меры, але паралельна прывялі да паступовай іх дэсакралізацыі [7, с. 159]. Правакавала падобны працэс умешванне грамадзянскіх улад у царкоўны рытуал шляхам вызначэння юрыдычных

наступстваў для суіцыдэнта праз выдачу/нявыдачу дазволу на яго хрысціянскае пахаванне. Вычляненне нейкіх нарматыўных прынцыпаў указвае на іх неактуальнасць, неадпаведнасць патрабаванням часу (састарэласць) са зменай навуковых падыходаў, адносінаў да з'явы. Таксама рост колькасці самазабойстваў падкрэсліваў неэфектыўнасць такога віду адказнасці ў цэлым як перашкаджаючага фактара, а адмова ад апелявання рэлігійнымі пастулататамі – відавочны працэс секулярызацыі грамадства. Пазіцыя ж дзяржавы, царквы, соцыуму цалкам супадала ў негатыўнай ацэнцы дадзенага дзеяння.

У народным уяўленні, па звестках фалькларыстаў, самазабойства лічылася няправільнай смерцю, грахоўнай, прошукамі д'ябла. У працы Д. К. Зяленіна знаходзім адпаведныя сцвярджэнні: «Белорусы Волковысского у. Гродненской губ. верят, что удавленники, утопленники и все самоубийцы могут ходить по смерти, так как их душами владеет черт» [8, с. 300]. У такіх нябожчыках («нечистых, заложных покойниках»), якія знаходзіліся паміж мёртвымі і жывымі, бачылі пэўную небяспеку. На месцы захаванняў самагубцаў часта накідвалі галлё, камені, каб нябожчык не ганяўся ці не пужаў жывых [8, с. 64]. Суіцыд падаваўся чалавеку даволі неспасціжнай з'явай, таму яго праяў баяліся. Падобныя факты знаходзім і ў архіўных дакументах. У справе аб суіцыдзе 8 мая 1862 г. у маёнтку Бродніцы Пінскага павета селяніна Андрэя Парчука маюцца сведчанні кшталту, як чуткі аб здарэнні разнесліся і на яго прыбеглі паглядзець мясцовыя жанчыны, то ў той момант Андрэй абарваўся з бэлькі і ўпаў на падлогу, а жанчыны ад спалоху з крыкамі ўцяклі з пакоя [9, арк. 35]. Сустракаюцца ў архіўных крыніцах і адсылкі да ўспрыняцця суіцыдальнага ўчынку вынікам адыходу ад веры. Напрыклад, з мясцовых роспытаў аб павешанні 25 сакавіка 1864 г. двараніна Вікенція Усакоўскага ў вёсцы Гарбуноўшчыне Слуцкага павета аказалася, што ён за жыццё надаваўся п'янству, устраняўся ад выканання хрысціянскіх абрадаў, ніколі не гаварыў штодзённай малітвы і нават не рабіў знак крыжа, часта бываў вельмі вясёлы і пасвістваў [10, арк. 7].

Устанавіць маштабы вывучаемага феномена складана з прычыны непаўнаты статыстычных дадзеных. Толькі з 1870-х гг. пачынаецца сістэматычны з шэрагам недахопаў улік. Па наяўнай статыстыцы ў беларускім рэгіёне назіралася дынаміка самагубстваў па ўзрастаючай лініі. У сярэднім на год у 1870–1874 гг. прыходзілася каля 163 выпадкаў, у 1875–1887 гг. – 190, у 1888–1893 гг. – 234. У першай палове XIX ст., па падліках К. С. Весялоўскага, за 1834–1841 гг. у краі фіксавалася каля 108 здарэнняў у год, а ў 1803 г. па ўсёй Расійскай імперыі ён прыводзіў

лічбу ўсяго 582 самазабойствы [11, с. 13, 20–22]. Доля ж самагубстваў ад ліку ўсяго памерлых насільна і раптоўна ў 1870–1874 гг. складала 7,3 %, у 1875–1887 гг. – 6,6 %, у 1888–1893 гг. – 7,2 %. Усяго з 1870 па 1893 г. у беларускіх губернях улічана 4696 суіцыдаў. З іх 1068 (або 22 %) – у гарадской прасторы, астатняе прыпадае на сельскую мясцовасць, што адпавядае аб'ектыўным умовам тагачаснага тэрытарыяльнага размеркавання насельніцтва. Лідарамі па суіцыдальнай актыўнаўсці ў 1870–1887 гг. выступалі Віленская, Мінская і Гродзенская губерні. У 1888–1893 гг. Гродзенскую губерню абагнала Віцебская. Праўда, абставіны адзначаных зрухаў пакуль выявіць не ўдалося [12, с. 4, 8, 12, 14, 16; 13, с. 12, 18, 24, 32, 34; 14, с. 20, 24, 28, 34].

У першыя два часавыя адрэзкі на 1 жаночае самагубства прыходзілася ў сярэднім 4 мужчынскія. У 1888–1893 гг. іх стала 3, значыць, колькасць жаночых самагубстваў узрасла. Сапраўды, у апошні аналізаваны перыяд сярэднегадавы паказчык жаночых суіцыдаў склаў 54,5, у папярэднія два атрымлівалася 37,7 і 30,5 выпадкаў. Прычыну росту навукоўцы бачаць у эмансіпацыі жанчын. Увогуле, грамадства, дзе суадносіны жаночых і мужчынскіх самазабойстваў адхіляюцца ў большы ці меншы бок, лічыцца незбалансаваным па адказнасці і цяжкасці клопатаў, ускладзеных на аднаго з палоў [15, с. 239].

Паводле заканадаўства Расійскай імперыі любая смерць патрабавала аператыўнай рэакцыі на яе прадстаўнікоў паліцэйскіх органаў. У пытанні з самагубствам высвятленне яго прычын было неабходна не толькі для выключэння магчымасці забойства, але і для таго, каб вызначыць ступень адказнасці для ахвяры (ці адмаўляць у хрысціянскім пахаванні і ці прызнаваць духоўнае завяшчанне сапраўдным). Расследуючы справы аб самагубствах, чыноўнікі ў асноўным прытрымліваліся нормы закона і пры гэтым дзейнічалі дастаткова хутка. Паколькі перадсмяротныя запіскі з-за непісьменнасці большасці насельніцтва пакідаліся рэдка, асаблівая каштоўнасць у архіўных матэрыялах належыць паказанням сведкаў, дзе выказваюцца мяркуемыя прычыны суіцыду.

Са 152 прааналізаваных выпадкаў вымалёўваецца пэўны вобраз бытавога самагубства ў беларускім грамадстве другой паловы XIX – пачатку XX ст. Яно насіла ўсесаслоўны характар і ў прычыннаматывацыйным спектры мела свой рэйтынг (вылучым умоўны Топ-6). Найбольш распаўсюджаным чыннікам аказаліся саматычныя хваробы (катары, завароты кішок, прырашчэнні і грыжы на розных органах) [16]. Узровень і даступнасць тагачаснага медыцынскага абслугоўвання часта пераўтваралі цялесныя пакуты ад боляў, што значна перавешвалі

дапушчальны балявы парог, у душэўныя, чым даводзілі асобу да крайняга адчаю. Другую прыступку заняло п'янства і яго наступствы ў выглядзе псіхафізіялагічнага знясілянне, белай гарачкі, часовага памутнення розуму [17]. Побач ішлі псіхічныя расстройствы [18]. Да іх уліку неабходна ставіцца з асцярожнасцю. Паколькі закон дазваляў такіх самагубцаў хаваць паводле хрысціянскага абрада, бывала, што родныя ахвяры імкнуліся яго абыйсці. З іншага боку, у соцыуме доўгі час панавала меркаванне, што самагубства чалавек можа здзейсніць выключна ў ненармальным разумовым стане. У простага абываценя ідэнтыфікаваць характар псіхічнага захворвання атрымоўвалася не заўсёды. Хаця ў крыніцах знаходзім пазначэнні меланхоліі, задуменнасці, тугі тыпу: «Причиною была видимо меланхолия, выказывающаяся в последнее время ее жизни постоянным пением унылых песен, после чего наступала обыкновенная задумчивость» [19, арк. 6 адв.].

У рэчышчы схільнасці жыхароў краю да стрэсаў, перажыванняў трапнымі падаюцца запісы этнографа-гісторыка Ф. Кудрынскага: «Он (беларус – А. С.) не привык ни говорить много о своих чувствах, ни выражать <…> Постоянное "себе не уме", обдумывание своего положения, вечные счеты с обстоятельствами данной минуты сделали его чувствительным ко всяким неожиданностям. Белорусс сильно принимает к сердцу неприятности, которыя ставят его втупик. Выход из затруднительнаго положения требует у него большого напряжения. Он не знает русскаго "авось"» [20, с. 95].

Калі ў псіхічных падставах самагубстваў чалавек бачыў нешта неспасцігальнае, то дабравольны сыход з жыцця з нагоды матэрыяльных і жыццёвых складанасцей для яго выступаў больш успрымальным. Яны быццам мелі цялеснае ўвасабленне (грошы, гаспадарка, дом, праца), гублянне якіх з улікам агульнагістарычнага фону тагачаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця магло давесці да стану фрустрацыі [21, арк. 163, 226, 295]. Таксама значная доля ў комплексе суіцыдальных матываў належала праблемам у асабістым і сямейным жыцці. У іх праяўленнях лідзіравалі няшчаснае каханне (здрада, рэўнасць, не дазвол уступіць у шлюб) і фізічнае насілле над жанчынамі, дзецьмі (найперш прыёмнымі), састарэлымі [22]. Паходжанне такіх адносін добра характарызуюць разважанні Віцебскага губернатара ад 27 мая 1898 г.: «Родственники к сиротам относятся с черствым равнодушием и полным безучастием <…> Крестьянские общества настойчиво уклоняются от призрения своих престарелых, больных и увечных членов семей, если призревают то натурою <…> к призреваемому хозяину однообществен-

ники относятся сурово, попрекают за лишний кусок хлеба и место занятое в хате» [23, арк. 61]. Панаванне грубай сілы ў паўсядзённасці парадзіла распаўсюджанасць яшчэ аднаго пабуджальнага штуршка (асабліва папулярнага ў дзіцячым асяродку) – страх перад пакараннем за здзейсненую правіну або злачынства [24]. Пры гэтым звычайна адной прычыны не існавала. Да самагубства правакавала іх сукупнасць, проста пэўная станавілася спускавым рычагом, свайго роду трыгерам.

Сярод відаў самазабойства выяўлены сапраўдны (давершаны) [16–19; 21–22; 24], выпадковы па ўласнай неасцярожнасці (найчасцей выпіванне атруты замест гарэлкі або лекаў) [25, арк. 13], дэманстратыўны (псеўдасуіцыд з мэтай прыцягнуць да сябе ўвагу, дасягнуць нейкіх жаданняў, нягледзячы на магчымасць атрымаць пакаранне ў выглядзе царкоўнага пакаяння) [26] і імітаваны (імітацыя забойства пад самагубства) [27]. У спосабах пераважала павешанне [28], затым ішло зарэзванне [29], атручванне [30], самастрэл [31] і ўтапленне [21, арк. 472], на што ўплывала даступнасць выкарыстоўваемых сродкаў. Невысокі працэнт самапатаплення звязаны са складанасцю яго фіксацыі (цела знаходзілі незаўсёды) і ідэнтыфікацыі (выпадковае, наўмыснае, рэальнае). Улічваючы лакальнасць ментальных уяўленняў чалавека той эпохі, месцамі здзяйснення з’яўлялася бліжэйшая жыццёвая прастора (дом, гаспадарчыя пабудовы, у лесе і полі пазбаўлялі сябе жыцця радзей). У сваю чаргу развіццё чыгункі парадзіла новы тып дзеянняў – кіданне пад цягнік [32, арк. 369]. Інтэнсіўнасць суіцыдальных паводзін адзначалася з красавіка па верасень, адпавядаючы агульнай карціне сезоннасці самазабойстваў. Сярэдні ўзрост ахвяраў прыходзіўся на перыяд найбольшай жыццёвай актыўнасці. Ён складаў дыяпазон ад 20 да 55 гадоў. У многіх рысах, уласцівых прыродзе самагубстваў разглядаемага перыяду, праследжваецца іх прамая залежнасць ад гендэрнасацыяльных роляў, выконваемых асобай. Па веравызнанні ахвяраў лідзіравалі прадстаўнікі хрысціянскіх канфесій, радзей – іўдзейскай, не выяўлена ніводнага выпадку сярод мусульман, што, хутчэй за ўсё, звязана з узроўнем іх рэлігійнасці.

Увогуле, станоўчая дынаміка суіцыдальнай актыўнасці выступала індыкатарам хваравітага стану тагачаснага грамадства, яго няўстойлівага культурнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця, злучанага з працэсам мадэрнізацыі, зменамі ў традыцыйным грамадстве, ростам сацыяльнай мабільнасці, крызісам сямейна-абшчынных адносін і т. д.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных. – Санкт-Петербург: Тип. 2 отд-ния собств. е. и. в. канцелярии, 1845. – 898 с. – URL: https://rusneb.ru/catalog/000199_000009_002889696/ (дата обращения: 03.02.2025).

2. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1866 года: С доп. по 1 янв. 1876 г. / Сост. проф. С.-Петерб. ун-та С. Н. Таганцевым. – 2-е изд., перераб. и доп. – Санкт-Петербург: тип. М. Стасюлевича, 1876. – 726 с. – URL: https://rusneb.ru/catalog/000199_000009_003545631/ (дата обращения: 03.02.2025).

3. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1885 года: Изд. проф. Имп. Училища правоведения Н. С. Таганцевым / сост. проф. С.-Петерб. ун-та С. Н. Таганцевым. – 5-е изд., доп. – Санкт-Петербург: тип. М. Стасюлевича, 1886. – 714 с. – URL: https://rusneb.ru/catalog/000199_000009_003545632/ (дата обращения: 03.02.2025).

4. Новое уголовное уложение, выс. утв. 22 марта 1903 г. – Санкт-Петербург: кн. маг. В. П. Анисимова, 1903. – 203 с. – URL: https://rusneb.ru/catalog/000199_000009_003714958/ (дата обращения: 03.02.2025).

5. *Паперно, И.* Самоубийство как культурный институт / И. Паперно. – Москва: Новое лит. обозрение, 1999. – 256 с.

6. *Хатуев, В. Б.* Уголовно-правовое регулирование ответственности за самоубийство в российском уголовном законодательстве: прошлое и настоящее / В. Б. Хатуев // Актуальные проблемы российского права. – 2019. – № 11 (108), ноябрь. – С. 81–95. – URL: https://doi.org/10.17803/1994-1471.2019.108.11.081-095 (дата обращения: 03.03.2025).

7. *Сыцько, К. В.* Справы аб расследаванні замахаў на самазабойства вернікаў Віленскай рымска-каталіцкай дыяцэзіяльнай кансісторыяй у XIX – пачатку XX стст. як гістарычная крыніца / К. В. Сыцько // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зб. навук. арт., прысвеч. 80-год. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы і 65-год. гіст. адукацыі ў Гродзен. дзярж. ун-це імя Янкі Купалы. У 2 ч. Ч. 1 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2019. – С. 159–162.

8. *Зеленин, Д. К.* Избранные труды. Очерки русской мифологии: Умершие неестественною смертью и русалки / Д. К. Зеленин; вступ. ст. Н. И. Толстого; подготовка текста, коммент., указат. Е. Е. Левкиевской. – Москва: Изд-во «Индрик», 1995. – 432 с.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 534. Воп. 5. Спр. 1297.

10. НГАБ. – Ф. 171. Воп. 1. Спр. 2868.

11. *Веселовский, К. С.* Опыты нравственной статистики России / К. С. Веселовский. – Санкт-Петербург: Тип. М-ва внутр. дел, 1847. – 64 с.

12. Статистический временник Российской Империи. Серия II. Выпуск 19. Статистические сведения о пожарах и о насильственных и внезапных смертях в Европейской России в период 1870–1874 г. ЦСК МВД. – Санкт-Петербург, 1882. – 305 с. – URL: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/46833-ser-2-vyp-19-statisticheskie-svedeniya-o-pozharah-i-o-nasilstvennyh-i-vnezapnyh-smertyah-v-evropeyskoy-rossii-v-period-1870-1874-g-1882 (дата обращения: 05.03.2025).

13. Временник Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел / Россия. Центр. стат. ком. – Санкт-Петербург, 1888–1903. № 35. Умершие насильственно и внезапно в Европейской России в 1875–1887 гг. ЦСК МВД. – СПб., 1894. – 67 с. – URL: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/57574-locale-nil-35-umershie-nasilstvenno-i-vnezapno-v-evropeyskoy-rossii-v-1875-1887-gg-1894 (дата обращения: 05.03.2025).

14. Временник Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел / Россия. Центр. стат. ком. – Санкт-Петербург, 1888–1903. №41. Умершие насильственно и внезапно в Европейской России в 1888–1893 гг. ЦСК МВД. – СПб., 1897. – 95 с. – URL: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/57575-41-umershie-nasilstvenno-i-vnezapno-v-rossiyskoy-imperii-v-1888-1893-gg-1897 (дата обращения: 05.03.2025).

15. *Гатальская, К.* Самоубийства на беларуских землях в начале XX века / К. Гатальская // Деды. – 2011. – № 8. – С. 237–249.

16. НГАБ. – Ф. 155. Воп. 1. Спр. 748, 787, 1134.

17. НГАБ. – Ф. 171. Воп. 1. Спр. 2655, 2868, 2881.

18. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 3990, 3991, 4213.

19. НГАБ. – Ф. 534. Воп. 5. Спр. 1377.

20. *Кудринский, Ф.* Белорусы (Общий очерк) / Ф. Кудринский // Виленский календарь на 1905 простой год. – Вильна, 1904. – С. 93–108. – URL: https://zapadrus.su/bibli/arhbib/1469-fedot-kudrinskij-belorussy-obshchij-ocherk-chast-ii.html (дата обращения: 01.03.2025).

21. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 5490.

22. НГАБ. – Ф. 145. Воп. 2. Спр. 1330, 1332.

23. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 43887.

24. НГАБ. – Ф. 155. Воп. 1. Спр. 1133, 1691, 2433.

25. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6871.

26. НГАБ. – Ф. 163. Воп. 1. Спр. 1267.

27. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 9099.

28. НГАБ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 547.
29. НГАБ. – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 1208.
30. НГАБ. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 615.
31. НГАБ. – Ф. 531. Воп. 9. Спр. 23.
32. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7407.